АДДЗЕЛ АДУКАЦЫІ ДЗЯТЛАЎСКАГА РАЙВЫКАНКАМА ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА АДУКАЦЫІ «ХВІНЯВІЦКАЯ СЯРЭДНЯЯ ШКОЛА»

# Музей «Скарбы дзядоў нашых»

Хвінявічы, 2022



Наш музей – гэта не толькі экспанаты, але і дух нашых продкаў, увасобленых ў іх. Гэта наша спадчына, якую мы павінны захаваць для будучых пакаленняў.



Наш адрас: Рэспубліка Беларусь, Гродзенская вобласць, Дзятлаўскі раён, аграгарадок Хвінявічы, вуліца Леніна 2В

тэлефон 80156334592

Сайт https://hvinevichi.schools.by/

Свой родны кут, бацькоўскі дом!
Усёй душой к табе імкнуся,
Сустрэнеш ты мяне дабром,
Дзе б я не быў, к табе вярнуся.

Музей “Скарбы дзядоў нашых” ва ўстанове быў адкрыты ў 2017 годзе. Але яго гісторыя пачынаецца значна раней. Спачатку гэта быў проста этнаграфічны куток на базе кабінета беларускай мовы і літаратуры. Але экспанатаў станавілася ўсё больш і больш, і ў 2005 годзе быў створаны музейны пакой. Зараз жа гэта музей, у якім  знахозіцца на захаванні 233 прадмета.  Гэта і прадметы ткацтва і вышыўкі, і абутак, і прадметы працы і хатняга ўжытку чалавека.











У музеі сабраны рэчы, якія расказваюць пра жыццё і быт нашых продкаў. На сённяшні дзень працуюць 5 экспазіцый:

- «Прадметы хатняга ўжытку»
- «Абутак беларусаў,
- «Прадметы вышыўкі і ткацтва»
- «Бабін кут»
- «Чырвоны кут, покуць»

У музеі праводзяцца інтэрактыўныя экскурсіі: “Каля бабулінай печы”, “Гісторыя ў рэчах”, “Сімволіка беларускага ручніка” і інш.